# НІНА ЛІТВІНКА



## На Палессі — ружова-барвовы захад

Нарысы

Літвінка Ніна нарадзілася ў Маладзечне 4 верасня 1990 года. Скончыла Інстытут журналістыкі БДУ. Фіналіст Міжнароднага конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». Творы друкаваліся ў зборніку «Мой дзень пачынаецца», альманаху «Terra poetica» і іншых. Займаецца фатаграфіяй і жывапісам. Піша вершы і прозу.

Калі прыязджаем да бацькоў, мы заўсёды робімся дзецьмі, колькі б год нам ні было. Завітваем да мамы і таты, да братоў ці да іншых сваякоў — адразу адступаюць праблемы, забываюцца клопаты. Тут ты маладошы хлопчык ці дзяўчынка, бо ёсць старэйшыя, якія звычайна прымаюць рашэнні. І памяць, і звычкі, і самыя твае адчуванні расслабляюцца — ты маладошы.

Як трапляю ў вёску, дзе расла і праводзіла шмат-шмат часу ў дзяцінстве, я адчуваю, нібыта няма за плячыма ніякага вопыту, у тым ліку няма зробленых памылак, няўдалых вырашэнняў і ўпушчаных шанцаў. Вось гарызонт, які разбягаецца ў тры бакі — такое ўдалае месца для размяшчэння хаты і двара,— вось тое ж самае нізкае неба з пухнатымі белымі аблокамі над галавой, палі, якія дыхаюць той жа сілай, што і раней; абрыс ніводнай валожынскай гары не змяніўся, сонца гэтаксама выглядвае з-за высокіх траў, з-за збажыны — ты нахіляешся і на сінія лапікі неба знізу глядзіш скрозь жоўтыя каласы. А потым выкочваецца празрыста-белы тоўсты месяц на прыцямнелую далячынь і завісае над тваім полем. Ёсць ты, якой ці то 5, ці то 35; і твае босыя пяты, пры ўмове апошняй лічбы, больш адчувальна рэагуюць на вострыя сцёблы зрэзанай травы — маленькая дзяўчынка звыкла да гэтага, у адрозненні ад дарослай гарадской дзяўчыны. Але ў гэты момант табе 5, таму ты не тое што любіш гэтыя духмяныя высокія травы, ты ўспрымаеш іх арганічнай часткай сябе. Няхай пачакае будучыня. Няхай развеюцца ўсякія думкі, што нешта можа не атрымацца. Ты можаш усё.

...Мы прыехалі да сваякоў мужа на Палессе, зусім не вядомае мне да нядаўняй пары. Памятаю сваю першую сустрэчу з Жыткавічамі. 17-тысячны гарадок, невялікія жылыя дамы савецкага тыпу, непрывабны для мяне цэнтр. Адзін з маіх

выразаў, якім я апісала гэтае месца сяброўцы: «Тут пакуль не ступала нага ніводнага інвестара». Тады мы завіталі, каб пазнаёміцца з бацькамі будучага мужа, праехаліся па горадзе, яшчэ нават не зайшлі ў кватэру, а мне ўжо зрабілася так сумна-сумна — ад думкі, што раптам мне аднойчы давядзецца тут жыць. Гэтае месца сапраўды можна назваць «правінцыяй», у параўнанні з ім мой родны Маладзечна — культурная сталіца і ўтульны, маленькі мегаполіс.

Ёсць у Жыткавіч іншы бок. Лясны. За вокнамі кватэры, за метраў 100, стаіць школа, а за ёй, яшчэ праз 50 метраў, пачынаецца сасновы лес. У той першы прыезд я нарвала ў ім два вялікія белыя букеты пралесак. Мы ішлі лесам уздоўж штучных водных рыбных каналаў, а яны ўсё не сканчваліся — ні лес, ні гэтыя рэчкі. У горада моцныя лёгкія, яны запоўнены кіслародам. Горад-лес, і гэта адна з прычын, чаму я яго люблю.

У 20 кіламетрах ад горада знаходзіцца вёска, з якой паходзіць мужаў бацька. Яна размяшчаецца ў месцы зліцця дзвюх рэк, на беразе адной, меншай рачулкі. Вёска даволі вялікая, двароў на 300—400. Частка дамоў размешчана ўздоўж берага ракі, адразу на ім. Наша хата — на другой берагавой лініі, калі казаць моваў курортаў. Да ракі 3—4 хвіліны хады, можна зрэзаць праз суседскі гародчык, а можна пайсці сцяжынкай. Ва ўсіх жыхароў першай лініі ёсць драўляныя вузкія лодкі з тонкімі носікамі, яны прывязаны ўздоўж усяго берага — кожная на ўчастку ракі ля свайго дома.

Нас заўсёды цёпла прымаюць — мы дарагія дзеці, зусім няважна, што дарослыя. На мангале смажыцца рыбка, вылаўленая ў рэчцы, у патэльні на вогнішчы, у распаленым масле, шкварчаць маленькія маладыя бульбінкі. Тут і міска свежых чарніц, і смажаная курыца з невялікай пераноснай духоўкі, і вялікая талерка напечаных аладак — каб хапіла ўсім.

Я люблю знайсці вольную хвіліну — калі не трэба дапамагаць і калі на мне не віснуць, як гронкі, пляменнікі — і схадзіць да ракі, паслухаць яе настрой, пакратаць моцнае карэнне дрэў на берагах, адчуць дыханне зямлі, паглядзець на неба, якое так нізка і ўсміхаецца свайму адбітку ў вадзе.

Кожны раз я пішу на Палессі новы верш. Ці то таму, што атмасфера адпаведная, ці то таму, што я ўжо так прывыкла. Мінулы раз думала аб гэтым і спецыяльна ўлучыла гадзінку, калі засталася адна, ні на што яе не растрачвала, села, падумала і напісала. А ў гэты раз узяла з сабой у паездку свой асаблівы сшытак для тэкстаў і ноўтбук — адчувала, што хачу пісаць прозу. І вось ужо вечар, я ціха клацаю сабе па клавішах. Дзіўнае адчуванне, што не хочацца марнаваць час ні на што, бо тут я буду пісаць.

У Менску сёння была лютаўская зіма. А на Палессі — ярка-памаранчовы і ружова-барвовы захад сонца, ён ідэальна бачны з акна кватэры. І за нейкія 40 хвілін я напісала гэты тэкст. Вось вам і «не ступала нага інвестара».

## Рычоў, пакліч мяне

Мы паехалі глядзець, як разліваецца рака. Як выкочваецца яна з берагоў, як мяккім, шурпатым языком аблізвае сцежкі, як лашчыцца і прыабдымае сталёвай хваткае тое, на што раней глядзела толькі здаля. Звярнулі ля моста, трохі праехалі па грунтовай дарозе, крута павярнулі машыну ўлева, ступілі пару крокаў — пад нагамі ледзяная тоўшча.

Вада замерла, паснулі травы, накрыўшыся празрыстай коўдрай лёду, нібы нехта нябачны ўклаў іх у такую паўжывую карціну, замацаваў шклом, пакінуў да лепшых часін, спадзеючыся, што яны не вызваляцца ніколі, што гэты гаспадар назаўсёды зможа пакінуць ледзяныя выявы сабе. Як адбылося гэта ў прыродзе? Як атрымалася такое ў рацэ? Яна выйшла за межы, парушыла правілы, сягнула на тэрыторыю палёў, якія раней ёй не належалі.

Ніхто не папярэджваў, але прырода ўжо чакае вясну. У якім календары пазначана? З якіх надзейных крыніц даляцела такая чутка? Вясна будзе! Вясне дарогу!

Залівайце, рэкі, наваколлі, тапіце пусткі, укрывайце празрыстымі коўдрачкамі тое, што пакуль спіць. Спі-спі-спі. Бо хутка ўжо прыродзе прачынацца на цэлае лета, на прахалодную вясну, на ўтульную, руплівую восень. Спі-спі-спі. Бо праз невялікі час зазвініць будзільнік, жаўрукі ў небе абвесцяць радасную песню абуджэння.

Селі ў машыну і паехалі далей, глядзець Тураў. Але і там нас заспела разлітая рака. Сочыць за намі ці што?.. Адразу за замкавай гарой ляжаць яе некранутыя, чыстыя люстэркі. Глядзіся ў іх, прыгажуня-неба, рыхтуйся нарумяніць шчокі барвовымі заходамі і ружовымі ўсходамі сонца.

Над ракой, у прыватны сектар Турава, перакінуты невялічкі жалезны масток. Ён такой шырыні, што толькі двум чалавекам прайсці ці аднаму раварысту праехаць. Калі мы крочылі па мосціку, наперадзе паказаўся раварыст і так і застаўся стаяць на месцы, прапускаючы нас.

Адразу за мосцікам ляжаць выцягнутыя на зіму на бераг, перавернутыя дагары дном, драўляныя лодкі, добра прасмаленыя зверху, чорнага колеру. Зямля навокал, асабліва на прыватных падворках, таксама насычанага чорнага колеру (можа быць, яе ўгнойваюць вугалем?). Рака пануе паўсюль, яна цярплівай нявестай раскінула свае паркалёвыя вэлюмы па наваколлі. Прыйдзе жаніх-вясна, пацалуе, сагрэе яе халоднае сэрца — вось і ўсё, аддаючы яму сябе навекі, яна скіне белыя пышныя ўборы, застанецца той жа зграбнай, танклявай дзяўчынай, якой была заўжды. Завітай хутчэй, пасватайся! Каб яна адагрэлася, каб былі перавернуты на свае звыклыя пазіцыі лодкі, каб людзі падаставалі з сухіх месцаў вёслы і паплылі па справах.

...Мы вяртаемся па мастку і зноў ідзём пешшу між замкавых узгоркаў. Я нібыта чую побач лязганне кальчугі, сталёвы скрыгат металу, цяжкі тупат — гэта ідуць дружыны мясцовых князёў. Але таго, што за стромкім блізкім схілам, не бачна. Калі ўзбіраюся на яго збоку, я і сама раблюся нібыта ваяром, быццам дух ранняга Сярэднявечча напаўняе мяне. Звіняць, звіняць кальчугі, даспехі, мячы — пакуль што не ад бойкі, а ад хады. Што ж скажа князь? За якую мэту я падыму свой меч?..

Выязджаем і бачым наперадзе, напрыканцы шыракаватай дарогі, вялікую прыгожую царкву. Перад намі з бакавой дарожкі выслізгвае «масквічык» з прыцэпам, я паспяваю яго сфатаграфаваць на фоне царквы. Удалы кадр. Хаця на месцы масквіча мог бы быць вершнік ці хаця б мужчына з канём, запрэжаным у воз, для большай трапнасці карціны.

Даволі рандомна (хаця гэта на яго не падобна) мой кіроўца выбірае на мапе адну з суседніх вёсак. Мэта — мястэчка з каларытнай назвай Рычоў.

Выязджаем за Тураў, трохі аддаляемся, і тут нас абдымаюць бяскрайнія палі. Вось праўда, я ніколі не бачыла ў нас такой колькасці свабоднай, незабудаванай зямлі. Думаецца, што Тураўшчына — гэта нашмат больш пра Беларусь, чым Беларусь цэнтральная. Прыязджаеш сюды, каб адчуць моц сваёй зямлі. Мяне нібыта сціскае з усіх бакоў яе прастора, веліч, бяскрайнасць. Не ведаю, як пачувацца, гэта сапраўды нова, ты сам-насам са сваёю зямлёй, прыціснуты да яе далонню магутнага неба. Будзь валадаром, чалавеча, цябе для гэтага Бог стварыў і памясціў сюды, пад белыя-белыя крылы.

...Мы зноў едзем, заварочваем у Пагост, каб паглядзець на разліў яшчэ адной рэчкі. Ужо добра цямнее. Сапраўды, і Ствіга выйшла з берагоў метраў на 10 і замерла пад коўдрай лёду. У прыцемках я звяртаю ўвагу на тое, якія ж таўшчэзныя на берагах растуць дрэвы. Колькі вам, мо 300 год?.. Рака дыхае, рака гаворыць са мной на сваёй мове. Яна перадае мне кавалачак закаванай сілы, каб у прызначаны час, калі заквітнее мая вясна, я змагла выплеснуць усё тое, што стае зрабіць.

Едзем, і, нягледзячы на гудзенне машыны, якое суправаджала нас амаль увесь час, я адчуваю сябе да краёчкаў напоўненай цішынёй. Як белы гліняны збаночак з малаком ці вадой. Я ашчадная, імкнуся не расплюскаць. Гэта так каштоўна — несці ў сабе цішыню.



## Чалавек, які выйшаў з вады

Я сустракала яго і раней: на бяседах, на сумесных святах, на вакзале, калі праважала на цягнік. І толькі цяпер даведалася, што гэта чалавек вады. Ён не ад мора, не ад акіяна, не ад заліваў. Ён ад мясцовых рэк.

Калі метафарычна (насамрэч гэта не так), ад яго пахне цінай, на плечы накінуты сеткі для лову рыбы, на нагах, між пальцаў, дзе-нідзе захраслі сухія водарасці і ракавінкі. Я б такім уявіла яго, калі б пачула штосьці пра гэтага чалавека вады раней. Але насамрэч ён выглядае звычайным мужчынам, сталым, як на мой густ — даволі сімпатычным, трохі стомленым і хворым. Ды ўсё гэта ўжо не важна. Істотна тое, што яго нарадзіла рака.

Чатыры разы ён тануў, і чатыры разы вышэйшая сіла працягвала яго жыццё. Аднойчы было так. У лёд умерзла лодка, яе выдзеўблі, дасталі і забралі дадому, каб не псавалася. А хлопчык коўзаўся па лёдзе, ганяў сваю шайбу і — «шусь» пад лёд, у тую вялікую адтуліну ад лодкі. Здарэнне ўбачылі старэйшыя хлапчукі, хутчэй пад'ехалі, адзін з іх засунуў клюшку пад лёд — маленькі чалавек вады схапіўся за яе і тым быў уратаваны. Тры наступныя разы ён правальваўся пад лёд на ўскрайку ракі — лёд звычайна больш тоўсты ў цэнтры, а па берагах тонкі. Кожны раз яго паспяваў выхапіць з-пад блізкага лёду ці то дзядзька-сусед, ці то сябар па коўзанні.

Двойчы ён сам уратоўваў жыццё. Неяк дастаў са сцюдзёнай вады такога ж небараку, што праваліўся пад лёд. А другі раз, улетку, адбылося так, што яго сябар сек карані дрэва, якое расло на беразе. Нечакана з вады на бераг высунуўся хлопчык, а той, другі, не паспеў зарыентавацца, спыніцца — замахнуўся сякерай і ўдарыў яго па галаве. Думаючы, што нарабіў бяды, гора-лесасек вельмі спужаўся, кінуў прыладу злачынства і пабег дадому. А наш герой падхапіў параненага хлопчыка, не даў захлынуцца ў вадзе — аказалася, што яму толькі трохі падзёрла скуру, чэрап застаўся непашкоджаны, таму хлопец застаўся жывым і здаровым.

Яго любімыя рыбы — гэта шчупакі і акуні. Шчупакі ловяцца на блясну. Гэтымі рыбінамі, старанна прыгатаванымі рукамі роднай жанчыны, ласавацца найбольш прыемна.

Неяк бацька злавіў вялізнага, больш чым метровага шчупака. Даставіў жонцы, каб тая прыгатавала. Маці панесла яго назад да ракі — там было чысціць зручней за ўсё. Яна абдзёрла цалкам луску з аднаго боку. Але рыба, відаць, была трохі аглушаная ці ачмурэлая, яна раптам прачнулася, моцна пляснула хвастом — толькі яе і бачылі. Давялося жанчыне вяртацца дадому ні з чым і прызнавацца мужу, што быў шчупак, а больш шчупака няма, сплыў туды ж, адкуль яго толькі-толькі дасталі.

Я часта распытваю чалавека вады пра лодкі, і ён заўсёды з ахвотай пра іх распавядае. На зіму ўсе лодкі дастаюць з вады, іх пераварочваюць і кладуць на металічныя штандары — так і пакідаюць ляжаць на ўвесь час на беразе. Разаграваюць на агні смалу, на трэску намотваюць кавалак анучкі, абмакваюць яго ў чорную вадкасць і такім чынам старанна прапітваюць лодку, каб яна добра захоўвалася і не прапускала ваду, робяць гэта яшчэ ўвосень, пакуль не прыціснулі маразы. А вясной, восенню і ўлетку, пасля 3—4 месяцаў карыстання, лодку таксама трэба даставаць з вады і зноў асмольваць.

Такія чаўны рабілі мясцовыя майстры, часам яны ехалі за Прыпяць, каб там знайсці галінкі адпаведнай крыжовай формы, якія паслужаць асновамі для лодкі. Чалавек вады кажа, што сто разоў бачыў, як робяцца лодкі, і няма ў гэтым нічога складанага. У той жа час лодка вырабляецца доўга, і гэта нават даўжэй, чым падняць драўляны зруб хаты...

Лодкавыя майстры сыходзяць, адпраўляюцца ў вечнае плаванне без зваротных адрасоў. Але пакуль што іх драўляныя прасмаленыя чорныя лодкі ўпрыгожваюць і падпіраюць берагі ўсіх рачулак на Палессі.

Чалавек ракі прыгадвае, што з каранёў дрэў і ялін рабілі вельмі прыгожыя цацкі, бо іншых прылад для забаў тады не было.

Што яшчэ расказаць пра яго жыццё?.. Хіба тое, як ён навучыўся плаваць.

Ніхто не сачыў за тагачаснымі дзецьмі. Яны, як маленькія рыбкі, занырвалі ў ваду з берага і самі асвойваліся ў ёй. Тануць нікому не хацелася, таму, калі адчувалі, што зямля сышла з-пад ног, што сітуацыя выйшла з-пад кантролю, даводзілася ўсё адно выплываць (ніхто ж не назіраў, не прыйшоў бы на дапамогу), даводзілася адкрываць сваю рыбіну натуру. Плаваць ён навучыўся ў 2 гады.

Кіраванне лодкай засвоіў па такім самым прынцыпе. Хлопчыку ракі было 5—6 год, суседка пасадзіла яго ў вузкую драўляную лодку, дала вясло, адштурхнула ад берага і сказала: «А цяпер плыві...» Гадоў у 11—12 тое ж самае адбылося паміж ім і маторкай. Мясцовы мужчына паказаў два рычагі — газу і руля — і таксама адштурхнуў ад берага, з тымі самымі словамі.

Усё яго дзяцінства і ранняя маладосць былі звязаныя з ракой. Там лавілі рыбу, там гуляліся, там проста бавілі вольныя хвіліны. Ён распавёў, што рэкі ў той час у прамым сэнсе кішэлі рыбай. Яеналоўлівалі поўныя кошыкі, харчаваліся амаль што адной рыбай і пачуваліся вельмі добра. Часам мясцовыя мужычкі стаялі на дамбе, з дапамогай спецыяльных прылад проста цягалі з вады рыбу. Здаралася, наведвала міліцыя — разлік быў сціплы, «бралі ўсяго мяхі два рыбы»,— а пасля з'язджалі, не выпісваючы ніякіх штрафаў. «А цяпер усіх штрафуюць, а рыбы ўсё адно няма»,— адзначае чалавек ракі.

Узімку рыбу лавілі з дапамогай «задухі». Гэта значыць, выбіралася месца, дзе ў лёдзе няма ніякіх лунак і адтулін. Рыба пачынала задыхацца, бо ёй не хапала кіслароду. У лёдзе каля берага прабівалася адтуліна. Рыба сплывалася да гэтага месца, на паверхню, каб глынуць кіслароду, а рыбак спрытна збіраў яе рукамі.

...Рака — гэта стыхія, лепшая сяброўка, карміцелька, настаўніца і напарніца ў гульнях. Яна падарыла незабыўны час ля вады, шыкоўнае дзяцінства чалавека, які выйшаў з ракі.

Цяпер ён моцна пасталеў, болей не жыве са сваёй жонкай. Яна любіць сцвярджаць, што гэта самы неадказны з усіх мужчын. У такія моманты я парырую: «Вы перабольшваеце. Усе мужчыны народжаныя адказнымі — гэта іх спрадвечная рыса».

«Асабліва тыя, што выйшлі з ракі»,— моўчкі дадаю пра сябе.

Ці не пахне ён рыбай або цінай?.. Я незаўважна прынюхваюся. Не, нічога такога.

Фота з архіва Н. Літвінкі